ла Саф'янава заняло мястэчка Глыбокае. 13 мая сюды з двума эскадронамі гусараў прыбылі генералы Каблукоў і Гудовіч. З імі прыехаў у Глыбокае і магілёўскі губернатар М.М.Мураўёў (1796—1866). Удзельнік Айчыннай вайны 1812 г., ён шаснаццацігадовым юнаком у складзе рускай арміі праз Відзы адступаў пад націскам напалеонаўскіх захопнікаў.

Пад старшынствам М.М.Мураўёва пачала працаваць камісія ваеннага суда. Яго саветнікам быў Зайкоўскі, сакратаром — Ліорна, які запісваў паказанні на допытах, рабіў іх пераклад.

На допыт было дастаўлена каля тысячы чалавек. Дапытвалі днём і ноччу, Мураўёў дзейнічаў рашуча і жорстка. Гэтая камісія была размешчана ў будынку кармеліцкага кляштара (паўднёвая частка царквы). Гэты будынак захаваўся і да нашых дзён. Дарэчы, у ліпені 1812 г. тут рабіў прыпынак Напалеон. Будынак кляштара стаў месцам чалавечых пакут і слёз. У літаратуры розных часоў шмат напісана пра метады вядзення следства, якія выкарыстоўваў Мураўёў, празваны ў народзе «вешальнікам». 24 мая адсюль у Дзінабургскую крэпасць былі адпраўлены першыя вязні (22 чалавекі). Былі заведзены 172 судовыя справы, якія і цяпер захоўваюцца ў Цэнтральным дзяржаўным архіве Літвы ў Вільнюсе. 59 тамоў зберагаюць памяць пра тыя даўнія падзеі, якія мелі месца і ў нашым краі.

Аб тым, як жорстка расправіўся царскі ўрад з паўстанцамі, сведчаць і такія факты. Кіраўнікі паўстання Брахоцкі, Татур, Лапацінскі былі засуджаны да пакарання смерцю. Асобы, якія прымалі актыўны ўдзел у паўстанні, былі прыгавораны да розных тэрмінаў зняволення і адпраўлены ў Дзінабургскую крэпасць. 72 чалавекі былі засуджаны ваеннымі судамі ў Мінскую турму. 23 адпраўлены ў турму г. Пскова. Частка паўстанцаў эмігрыравала ў Заходнюю Еўропу і Паўночную Амерыку. Сярод эмігрантаў былі 52 удзельнікі паўстання ў Дзісенскім павеце. Большасць з іх ніколі не вярнулася на радзіму.

Дзінабургская крэпасць так была перапоўнена вязнямі, што яе камендант вымушаны быў хадайнічаць аб вызваленні часткі засуджаных і перадачы іх на парукі. Няміала засуджаных было саслана ў Сібір. Пазней некаторыя справы былі перагледжаны, асобным удзельнікам паўстання зніжаны тэрміны зняволення.

У 1831 г. з Глыбокага Мураўёў быў пераведзены на пасаду губернатара г. Гродна. У 1863 г. яму зноў давялося пабыць некалькі дзён у Глыбокім у час задушэння паўстання пад кіраўніцтвам Каліноўскага.

Паводле загаду цара Мікалая I патрабавалася жорсткае пакаранне ўдзельнікаў паўстання 1831 г. Маёмасць засуджаных забіралася ў казну. Канфіскаваныя землі раздаваліся рускім чыноўнікам. Былі праведзены меры на паслабленне польскага ўплыву, актывізаваўся працэс русіфікацыі Беларусі. Быў закрыты Віленскі універсітэт, у школах і вучылішчах забаронена польская мова. У 1832 г. былі закрыты вучылішчы ў Лужках і Беразвеччы, дзе навучаліся дзеці памешчыкаў, шляхты з розных паветаў Беларусі, Літвы і Латвіі. У 1839 г. царкоўны сабор у Полацку прыняў рашэнне аб уз'яднанні уніяцкіх цэркваў з праваслаўнымі. Забаранялася выкарыстоўваць словы Беларусь, Літва. Гэта тэрыторыя атрымала назву Паўночна-Заходні край.

У 1842 г. былі ўзяты ў казну ўладанні глыбоцкіх кармелітаў: Глыбокае, Ластавічы, Перадолы, Запалоўе, Амбросавічы, Варанова, Свілы, Вольберавічы, Янкі, Крукі. Сюды былі накіраваны адміністратары, а кляштару пакінулі толькі 203 дзесяціны зямлі. Кармеліцкі кляштар і касцёл праіснавалі да 1865 г., а потым былі закрыты. У 1878 г. будынак касцёла пераасвячоны пад праваслаўную царкву, а бібліятэка з 3 000 кніг аддадзена Віленскаму музею старажытнасцей. Кляштарныя архівы кармелітаў былі вывезены ў Санкт-Пецярбург, дзе захоўваюцца і цяпер.

*І.У.Бунто.*

## Глыбоччына ў другой палавіне 19 — пачатку 20 стагоддзя

У сярэдзіне 19 стагоддзя мястэчка Глыбокае належала князю Вітгентштэйну — буйнейшаму землеўладальніку на Беларусі, які меў больш за 100 маёнткаў у 12 паветах, 500 тысяч дзесяцін зямлі і 60 тысяч сялян.

19 лютага 1861 г. быў абвешчаны маніфест аб адмене прыгоннага права і «Мясцовае палажэнне... для губерній Віленскай, Гродзенскай, Ковенскай, Мінскай і часткі Віцебскай». У Глыбоцкім краі рэформа праводзілася паводле «Мясцовага палажэння», у адпаведнасці з якім за сялянамі прызнавалася права на дарэформенны надзел. Адрэзкі дапускаліся ў выпадках, калі памер сялянскага надзелу перавышаў надзел, устаноўлены інвентаром. Зем-

леўладальнік, які адводзіў адрэзкі, меў магчымасць забіраць у сялян лепшыя землі, выганы, вадапоі, без якіх яны не маглі абысціся. За карыстанне зямлёй сяляне абавязаны былі да заключэння выкупной здзелкі адбываць памешчыку павіннасці ў выглядзе паншчыны і аброку. Такое становішча сялян лічылася часоваабавязанае. Гэтыя ўмовы выклікалі рэзкае незадавальненне сялян, якія адмаўляліся адбываць павіннасці.

Так, у лісце арандатара мястэчка Глыбокае В.Шміта галоўнаму кіраўніку маёнткаў князя Вітгенштэйна ад 6 мая 1861 г. паведамлялася, што сяляне Юзаф Шарабайка, Васіль Далідудка і Усцін Падбудзінскі ўчыняюць беспарадкі і падбухторваюць сялян не выконваць павіннасці. Арандатар папрасіў неадкладна прыслаць салдат.

У данясенні ад 8 мая 1861 г. паведамлялася пра адмову сялян вёсак Шарабаі і Лаўцы адбываць павіннасці, з іх узялі прыклад і сяляне мястэчка Глыбокае. Арандатар мястэчка Вінцэнтава Свентажэцкі паведамляў у Галоўнае ўпраўленне арганізацыі аховы лясоў, што «сяляне, якія павінны ахоўваць лес, не выконваюць сваіх абавязкаў».

У сувязі з паўстаннем 1863—1864 гг. у Польшчы, Літве і на Беларусі царскі ўрад пайшоў на пэўную карэкціроўку папярэдніх указаў адносна адмены прыгоннага права (падрабязна пра падзеі 1863—64 гг. на Глыбоччыне гл. ў артыкуле «Паўстанне 1863—64 гг. на Глыбоччыне»). Паводле ўказа ад 2 чэрвеня 1863 г. усё сялянства Беларусі з 1 студзеня 1864 г. пераводзілася на абавязковы выкуп зямлі, часоваабавязанае становішча ліквідавалася. Вышэйшы падушны надзел вызначаўся ў 4—5 дзесяцін, ніжэйшы — 1,6 дзесяціны.

Пасля адмены прыгоннага права буйное памешчыцкае землеўладанне на Беларусі захавалася. Землеўладальнікамі былі не толькі памешчыкі-дваране, але і мяшчане і сяляне. Сустракаліся маёнткі, якімі валодала сялянская грамада.

Асноўнымі збожжавымі культурамі былі жыта, авёс, ячмень. Вырошчвалі лён і каноплі. У памешчыцкіх гаспадарках яшчэ ў сярэдзіне 19 стагоддзя выкарыстоўвалі механічныя прылады працы. Сяляне апрацоўвалі зямлю сахой, бараной, толькі ў канцы 19 стагоддзя пачалі выкарыстоўваць жалезныя плугі.

Пасля рэформы 1861 г. для апрацоўкі зямлі сялянамі шырока выкарыстоўваліся валы як больш танная для ўтрымання жывёла. Але ў сельскіх гаспадарках Дзісенскага павета аралі выключна коньмі.

Заможныя сяляне разводзілі і вырошчвалі пародзістых коней на камерцыйныя мэты. За продаж 3—4-гадовых жарабкоў у Прусію яны атрымлівалі па 200—300 рублёў. Коні палепшанай пароды былі і ў сялян Глыбоцкай воласці. Але пра становішча асноўнай масы сялянства ў гэтай галіне гаспадаркі можна меркаваць з тэксту пісьма графа Бражстоўскага ў Віленскі павятовы камітэт па патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці ад 3 жніўня 1902 г.

«... У сялян жывёла і коні не заслугоўваюць нават свайго наймення..., ёсць паселішчы, у якіх няма каровы даражэй за 16—20 руб., каня, які не каштуе і 30 руб..., быкоў купляюць на базары па 15—18 руб.; коней больш-менш моцнага складу прадаюць у Прусію, дома пакідаюць няздольных да работы; пытанне — як дапамагчы гору, сумнай будучыні? Я не бачу сродкаў пры такой пастаноўцы сялянскага быту. Напрыклад, калі б урад згадзіўся даць кожнаму паселішчу лепшай пароды быка і жарабка бясплатна, гэта не дапамагло б; падзелы зямель на дробныя часткі не садзейнічаюць паляпшэнню становішча, жывёла не мае пашы, на зіму не хапае фуражу, каровы ўтрымліваюцца толькі для атрымання гною, якога не хапае нават на тыя вузкія палосы, на якія падзелены надзелы сялян. Толькі ў сяле Мосар Луцкай воласці, у якім раней было 12 гаспадароў, цяпер 60 двароў, колькасць дзесяцін зямлі тая ж, колькасць жывёлы і коней каля 200; ці магчыма марыць аб паляпшэнні гаспадаркі, пароды жывёлы...?»

Важнай таварнай галіной была малочная жывёлагадоўля. Заможныя сяляне рэгулярна збывалі на рынак масла, смятану, тварог, многія з іх мелі сепаратары. Частка малака паступала ад сялян і памешчыкаў на маслабойныя і сыраварныя заводы. У канцы 19 стагоддзя ў Дзісенскім павеце дзейнічалі 11 зборных і 5 арцельных малочных заводаў, заснаваных гаспадарамі, якія мелі вялікія статкі кароў.

Пасля рэформы 1861 г. найбольшае пашырэнне на поўначы і паўднёвым усходзе Беларусі атрымала льнаводства. Ільнаводства складала галоўны кірунак спецыялізацыі гаспадаркі заможнай часткі сялян Дзісенскага павета. Але да канца 19 стагоддзя на сялянскіх надзелах адзначаецца скарачэнне пасеваў ільну. Гэта было звязана з паніжэннем кошту льновалакна, якое выцяснялася больш таннай і прыгожай бавоўнянай тканінай. У карэспандэнцыі з Дзісенскага павета паведамлялася, што ў выніку падзення цэн на лён пасевы яго скарачаліся і павялічвалася пасяўная плошча аўса і ячменю, на якія быў большы попыт.

Адной з галоўных таварных культур, пасевы якой значна пашырыліся з 1890-х гг., была бульба. Яна ўжывалася ў вялікай колькасці не толькі ў ежу, але і на корм жывёле. Бульба была асноўным прадуктам для вінакурэння. Вінакурныя заводы, якія прыносілі ўладальнікам вялікія прыбыткі, дзейнічалі ў маёнтку Чарневічы і мястэчку Глыбокае. Яны перапрацоўвалі ўвесь свой ураджай бульбы, а таксама суседніх вёсак. Памешчыкі прадавалі ў казну вядро спірту за 58,5 кап. Зярно для вінакурэння і на рынак перапрацоўвалася на млынах. Вадзяныя млыны былі ў в. Мылічаны, маёнтку Юзафава (Празароцкая воласць). Паравы млын працаваў у маёнтку Зябкі той жа воласці.

Сусветны аграрны крызіс канца 1870—90-х гг. прымусіў землеўладальнікаў перабудоўваць свае маёнткі на капіталістычны лад ці прадаваць іх. Глыбоцкі маёнтак князь Вітгенштэйн прадаў немцу Згерсу. Адкрываліся невялікія фабрыкі і заводы. Цагельны завод быў пабудаваны ў маёнтку Чарневічы Дзісенскага павета. Будаўніцтва цагляных заводаў было звязана з ростам гарадоў, будаўніцтвам адміністрацыйных будынкаў.

У 1880—90-я гг. ў беларускай вёсцы пашырана была арэнда зямлі. Бяднейшае сялянства арандавала зямлю да 5 дзесяцін на кароткі тэрмін, звычайна на адно лета, за адработкі ці за долю ўраджаю. Але вялікая частка сялянства вымушана была адмовіцца ад самастойнага вядзення гаспадаркі і здавала надзельную зямлю ў арэнду заможным сялянам, якія ад пасеваў ільну на ёй атрымлівалі прыбыткі да 300—500 рублёў (Дзісенскі павет). Гаспадарчыя грашовыя падаткі за арэнду зямлі і наём рабочых абыходзіліся ў сотні рублёў. Напрыклад, сяляне вёскі Шарагі кожны год выдаткоўвалі на гэтыя мэты да 400 рублёў.

У 1880-я гады ў новай сацыяльна-эканамічнай абстаноўцы, якая характарызавалася пагаршэннем становішча сялянскіх мас з-за ўзмацнення капіталістычнай эксплуатацыі, узрастае барацьба супраць памешчыкаў. Яна прымала розныя формы. Найбольш распаўсюджанымі былі патравы, выпасы жывёлы на ўгоддзях памешчыкаў і лясныя парубкі.

Вясной 1882 г. сялянскімі выступленнямі была ахоплена Глыбоцкая воласць Дзісенскага павета. Сяляне захапілі ўчасткі зямлі некаторых памешчыцкіх фальваркаў і зааралі іх.

Віленскі губернатар Жамчужнікаў у данясенні міністру ўнутраных спраў Талстому паведамляў пра сістэматычныя парубкі лесу сялянамі Дзісенскага павета ў першай палавіне 1885 г. У 1886 г. былі спробы захопаў памешчыцкіх сенажацей. Складанне пратаколаў і перадача спраў у суды не спынялі сялян.

Вялікую шкоду насельніцтву вёсак і мястэчак прыносілі розныя стыхійныя бедствы, асабліва пажары, няўроды. На іх выпадак сялянства страхавала сябе. Для гэтага была ўведзена сістэма хлебазапасных магазінаў. Такі магазін быў у кожнай сялянскай грамадзе. Кожны год ён папаўняўся збожжам, а старое выкарыстоўвалі. У гады недароду хлеб размяркоўваўся сярод пацярпелых. На тэрыторыі сучаснага Глыбоцкага раёна хлебазапасныя магазіны былі ў вёсках Мамаі, Ляпейкі, Храмы, Гарані, Каменка, Сяльцо, Сяменчыкі, Машыркі, Дзямідзенкі, Лапезіна, Булахі, Зябкі, Востраў, Стуканы, Шчарбы, Восава, Сукліна, Соіна, Задарожжа, Лісіцы, Лазовікі, Слабада, Вялікія Давыдкі, Мядзведзева, Свіла, Чарневічы, Верхняе, Удзела, Бервякі, Навасёлкі, Мосар, Дзеркаўшчына, Слабада.

Кожны недарод збажыны, голад і іншыя бедствы гналі сялянскую беднату на пошукі сродкаў існавання, перш-наперш у суседнія памешчыцкія гаспадаркі. Частка сялян бегла за межы Беларусі. Яны наймаліся на лесасплаўныя, будаўніча-дарожныя работы, шахты, руднікі. У промыслах прымалі ўдзел і жанчыны, пераважна з бядняцкіх сялянскіх сем'яў.

У «Аглядзе Віленскай губерні за 1908 г.» адзначалася, што вясковыя рабочыя Віленскай губерні ў вольны ад палявых работ час займаліся возніцтвам, высечкай і сплавам лесу па рэках Вілія, Нёман, Заходняя Дзвіна, рыбалоўствам і цяслярствам. «Многія займаліся вырабам дуг, колаў, вазоў. Распаўсюджаны сярод сялян губерні выраб палатна і пражы, якія паступаюць у продаж. Сялянскае палатно таннае, гатункі — мяшочны, на кашулі, тонкі. Вырабляюцца на простых станках грубое сукно і розныя ваўняныя вырабы».

Рост саматужных промыслаў і мясцовай прамысловасці патрабаваў збыту іх перш за ўсё на ўнутраным рынку. Рос попыт і на прамысловыя вырабы. Для гэтага ў вёсках, сёлах, мястэчках праводзіліся базары, таржкі, кірмашы.

У Глыбокім кожны тыдзень па чацвяргах праводзіліся кірмашы, на якіх гандлявалі прадуктамі харчавання, мануфактурнымі вырабамі, а таксама смалой, дзёгцем, паташам, якія прывазіліся з памешчыцкіх маёнткаў. Сяляне прывозілі сала, яйкі, масла, сыр, набывалі соль, крупы, гарбату, цукар, гарэлку. Да 1885 г. вядро гарэлкі каштавала 50 капеек серабром, а ў 1856 г. месцамі — 1 рубель 50 капеек. На кірмашы на продаж прыганялі коней.

24 чэрвеня праводзіўся кірмаш у в. Чарневічы. Два кірмашы на год 24 і 29 чэрвеня адбываліся ў вёсцы Мосар. Тройчы на год праводзіліся кірмашы ў сяле Слабада (23 красавіка, 14 верасня, 6 снежня) і 5 разоў у мястэчку Галубічы (23 красавіка, 9 мая, 15 жніўня, 8 верасня, 6 снежня). Звычайна кірмашы прымяркоўвалі да рэлігійных свят.

Акрамя кірмашоў былі пашыраны таржкі. Толькі ў мястэчку Галубічы яны адбываліся 6 студзеня, 9 мая, 15 жніўня, 8 верасня і 6 снежня.

Усё большае значэнне набывалі крамы. Крамы дробнага тавару былі ў вёсках Празарокі, Дзеркаўшчына, Верхняе, Удзела, бакалейная крама была адчынена ў мястэчку Галубічы.

Немалы прыбытак дваранам, купцам, заможным сялянам прыносілі піцейныя дамы і корчмы. Яны былі ў вёсках Зябкі, Верхняе, Дзеркаўшчына, Мосар, мястэчку Галубічы.

Праз корчмы памешчыкі выцягвалі ў сваіх прыгонных грошы, атрыманыя цяжкай працай. Часта за пітво разлічваліся хлебам, жывёлай. Кожная сялянская сям'я траціла штогод на гарэлку ў сярэднім 25—26 рублёў.

У другой палавіне 19 — пачатку 20 стагоддзя тэрыторыя сучаснага Глыбоцкага раёна ўваходзіла ў склад Глыбоцкай, Пліскай, Празароцкай, амаль усёй Залескай, частак Верхнянскай, Чарневіцкай, Луцкай, Лужыцкай і Ігуменскай валасцей Дзісенскага павета, некалькі населеных пунктаў уваходзілі ў Норыцкую воласць Вілейскага павета Віленскай губерні, а таксама Докшыцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні.

Паводле перапісу 1897 г. адной з буйнейшых валасцей Дзісенскага павета была Глыбоцкая. У воласці налічвалася 160 населеных пунктаў з 1875 дварамі. 59 двароў было ў вёсцы Гваздова. У ёй пражывалі 200 мужчын і 221 жанчына. Больш за 300 жыхароў мелі вёскі Лаўцы (186 мужчын, 176 жанчын), Прыпернае (166 м., 171 ж.), Ластавічы (209 м., 181 ж.), Абруб (178 м., 185 ж.), Шарагі (151 м., 152 ж.), Ясевічы (158 м., 168 ж.), Каралевічы (165 м., 182 ж.), Абруб-2 (183 м., 208 ж.), сёлы Забор'е (147 м., 182 ж.) і Мамаі (163 м., 210 ж.). Больш за 200 чалавек было ў вёсках Шунеўцы (137 м., 143 ж.), Сакавічы (111 м., 120 ж.), Падгаі (101 м., 114 ж.), Запруддзе (114 м., 103 ж.), Плявокі (104 м., 120 ж.), Бараны (101 м., 111 ж.), Запалоўе Старое (117 м., 143 ж.), Кавалі (133 м., 121 ж.), Шыпы (172 м., 132 ж.), Несцеравічы (147 м., 140 ж.), Слабада (103 м., 104 ж.), Замошша (127 м., 135 ж.), Забелле (108 м., 93 ж.), Станулі (109 м., 130 ж.). Больш за 100 чалавек было ў вёсках Ліхабалотцы (144), Тумашы (116), Жураўнёва (122), Харашкі (174), Шуневічы (154), Чачалі (139), Навасёлкі (170), Сарокі (119), Валодзькава (154), Варанова (126), Шубнікі (184), Гінькі (167), Каміншчына (196), Слабада (156), Бараны (192), Майсеенкі (141), Запалоўе Новае (125), Дзегцяры (189), Мацясы (123), Ляднікі (164), Міхайлаўка (144), Глыбокае (113). Усяго ў воласці пражывала 15 378 чалавек (7458 мужчын, 7920 жанчын).

Найбольш буйным па колькасці насельніцтва населеным пунктам Пліскай воласці была в. Восава (28 двароў, 424 жыхары, з іх 207 мужчын, 217 жанчын). У 56 вёсках, мястэчках, выселках воласці пражывала 7526 жыхароў (3821 м., 3705 ж.). Больш за 200 чалавек было ў вёсках Навасёлкі (99 м., 106 ж.), Шчарбы (131 м., 113 ж.), Крывічы (159 м., 133 ж.), Сукліна (99 м., 107 ж.), Задарожжа (108 м., 100 ж.), Мазнева (144 м., 108 ж.), Перадолы (116 м., 96 ж.), Свіла (сяло, 207), Свіла (вёска, 135 м., 153 ж.). У 16 вёсках воласці пражывала больш за 100 чалавек: Замошша (192), Паддуб'е (136), Вялец (172), Завулкі (167), Горкі (123), Свядава (100), Надазер'е (165), Слабада (192), Баяры (148), Дабрэзіна (150), Якубаўшчына (139) і Галубічы (173).

У 283 населеных пунктаў Празароцкай воласці налічвалася 1003 двары. У вёсцы Кульгаі пражывала 405 чалавек (202 м., 203 ж.), у в. Вострава — 270 (133 м., 137 ж.). З насельніцтвам больш за 100 чалавек былі наступныя населеныя пункты: Руднікі (178), Асінаўка (104), Храмыя (127), Саннікі (158), Шалушына (104), Піскунова (102), Булахі (113), Зябкі (107), Слабада (147), Юркава (106), Стуканы (113). У 230 невялікіх сёлах, хутарах, выселках, засценках, маёнтках колькасць жыхароў складала ў сярэднім ад 15 да 40 чалавек. Усяго ў Празароцкай воласці пражывала 11318 чалавек (5457 мужчын, 5861 жанчын).

У 49 вёсках Залескай воласці было 760 двароў. У вёсцы Залессе было 65 двароў і 382 жыхары (194 мужчыны, 188 жанчын). Больш за 200 жыхароў было ў вёсках Кісарэўшчына (106 м., 123 ж.), Стуканы (135 м., 145 ж.), Узрэчча (99 м., 115 ж.), Дзмітраўшчына (94 м., 11 ж.), Кухты (103 м., 109 ж.). У 16 вёсках воласці пражывала больш за 100 жыхароў: Загор'е (145), Калеснікі (139), Пыршчына (121), Лучайка 1-я (153), Лучайка 2-я (130), Макаўе (104), Леснікі (105), Бабічы (101), Майсюціна (135), Чаронка (119), Капыльшчына (153), Паловіца (112), Заборцы (126), Лучайка (135). Усяго ў воласці на 1897 год было 5486 жыхароў (2630 мужчын, 2856 жанчын).

З населеных пунктаў Верхнянскай воласці па колькасці насельніцтва вылучаліся вёскі Попшычы — 415 жыхароў (186 мужчын, 229 жанчын), Хоцькі — 277 (125 м., 152 ж.), Берවякі — 251 (122 м., 129 ж.), Ракаўцы — 394 (205 м., 189 ж.), Сапеліна — 199 (103 м., 96 ж.), Кавалёнкі — 154 (73 м., 81 ж.), Шаці — 170 (84 м., 86 ж.), Русакі — 102 (56 м., 46 ж.), Верхняе — 196 (94 м., 102 ж.), Навасёлкі 2-я — 185 (80 м., 105 ж.), Мурзы — 136 (67 м., 69 ж.), Навасёлкі 1-я — 204 (52 мужчыны, 52 жанчыны). У 20 населеных пунктах Верхнянскай воласці, якія і цяпер уваходзяць у склад сучаснага Глыбоцкага раёна, налічвалася 574 двары і 3552 жыхары (1746 м., 1806 ж.).


ТЭРЫТОРЫЯ ГЛЫБОЧЧЫНЫ
НА КАРЦЕ КАНЦА XIX ст.
З кнігі А.Сапунова і В.Друцкага-Любецкага "Матэрыялы па гісторыі і геаграфіі Дзісенскага і Вілейскага паветаў Віленскай губерні" (Віцебск, 1896).
Глубокое
Заборье
Шкяя
Условные знаки.
Почтовыя
Большія проѣзжія и торговыя
Проселочныя
Дороги
Почтовых дор. безъ станцион. знаковъ упразднены
Губернская и Областная
Уѣздная и Окружная
Подъѣздной путь
Границ.
Мѣстечко, пригородъ, слобода
Селеніе и деревня свыше 500 дворовъ
Селеніе и деревня отъ 40 до 500 дворовъ
30 _ 40
20 _ 30
Селеніе и деревня отъ 10 до 20 дворовъ
3 и 5 до 10
Господскій дворъ, мыза, фольварокъ, хуторъ, Чифтликъ
Церковь, кирка, костелъ, + Часовня
Цыфры при поселеніяхъ означаютъ число дворовъ въ десяткахъ
Масштабъ въ Англійскомъ дюймъ 10 в.
0
10
20
30 верстъ

У Чарневіцкай воласці такіх населеных пунктаў было 17, двароў 141, насельніцтва — 971 чалавек (494 мужчыны, 477 жанчын). Толькі 3 вёскі мелі больш за 100 жыхароў: Шыцікі (76 м., 61 ж.), Барысёнкі (47 м., 59 ж.), Бортнікі (57 м., 51 ж.).

У Луцкай воласці было 7 населеных пунктаў, 228 двароў, 1279 жыхароў (610 мужчын, 669 жанчын). Найбольш буйныя вёскі: Мосар — 388 жыхароў (182 м., 206 ж.), Лужкі — 249 (116 м., 133 ж.), Панфілаўшчына — 175 (78 м., 97 ж.), Гатоўкі — 164 (89 м., 75 ж.), Варанцы 117 (58 м., 59 ж.), Гірстуны — 112.

Дзве вёскі былой Лужыцкай (Забалоцце — 149 жыхароў і Белякі — 152 жыхары) і Ігуменаўскай (Бахіры — 89 жыхароў і Бруйкі — 43 жыхары) валасцей уваходзяць у тэрыторыю сучаснага Глыбоцкага раёна.

16 вёсак, маёнткаў, хутароў, засценкаў з 196 дваровымі месцамі Норыцкай воласці цяпер таксама ўваходзяць у Глыбоцкі раён. З іх толькі 6 мелі больш за 100 жыхароў: вёскі Дзеркаўшчына — 211 (98 м., 113 ж.), Праходы — 153 (65 м., 88 ж.), Бялевічы — 219 (111 м., 108 ж.), Завараты — 118 (58 м., 60 ж.), Ласкаўшчына — 113 (61 м., 52 ж.), аколіца Латыголь — 137 (68 м., 69 ж.).

24 населеныя пункты Докшыцкай воласці Барысаўскага павета Мінскай губерні, якія цяпер адносяцца да Глыбоцкага раёна, мелі 204 двары з насельніцтвам 1169 чалавек (613 мужчын, 556 жанчын). Толькі ў вёсках Слабада пражывала 299 чалавек (146 м., 153 ж.), Іванаўшчына —. 182 (90 м., 92 ж.), у мястэчку Галубічы — 119 (66 м., 53 ж.), астатнія мелі ад 10 да 30 жыхароў.

Усяго на гэтай тэрыторыі пражывала прыкладна 49—50 тысяч чалавек.

У 1897 г. ў Глыбокім было 637 дваровых месцаў і жылых дамоў. Тут пражываў 4741 жыхар (2247 мужчын, 2494 жанчыны). Мястэчка было сумежным з маёнткам Глыбокае ўладальніка Готліба Скерста. У мястэчку было народнае вучылішча, яўрэйскае прыватнае вучылішча, валаснoе праўленне, 2 яўрэйскія малельныя дамы, мяшчанская ўправа, 4 хлебазапасныя магазіны. Дзейнічалі 2 заводы ліманадна-шыпучай вады, 2 шавецкія майстэрні, 5 мануфактурных крам, 2 аптэчныя крамы, 96 дробных крам.

У мястэчку існавалі 11 піцейных дамоў, 4 заезныя дамы і 2 харчэўні.

Развівалася мукамольная вытворчасць. 2 вадзяныя і 2 ветравыя млыны ў Глыбокім не спраўляліся з памолам збожжа, і прадпрымальнік Перац Мірман пабудаваў у 1911 г. ў Глыбокім млын, які прыводзіўся ў рух дызелем. Мураваны будынак гэтага млына і цяпер стаіць на вуліцы Дзяржынскага.

Для вытворчасці піва і дражджэй быў пабудаваны невялікі завод на беразе возера Кагальнае. У Глыбокім была абаранaчная, якой валодаў Страговіч, тут працавала 10 чалавек, некалькі хлебапякарняў і булачных. Была наладжана вытворчасць танных цукерак. Невялікая маслабойня выраблялa льняны і каноплянаы алей.

У вёсках Падгаі і Арэхава былі цагельныя заводы, у в. Арэхава працаваў вапнавы завод, у маёнтку Азерцы выраблялася чарапіца.

У 1890-я гг. ўрад арганізаваў у Глыбокім «склад у разліў» віна і гарэлкі. Для гэтага было ўзведзена некалькі мураваных будынкаў, у якіх цяпер размешчана бальніца. На складзе працавала больш за 200 чалавек, пераважна жанчыны. Продажам гарэлкі ў Глыбокім займаліся 2 вінныя крамы «манапolькі».

Былі ў Глыбокім і свае, вядомыя ў розных галінах гандлю купцы: Краўта гандляваў віном, Мусіна збожжам і мукой, Салавейчык — рыбай, Левітан — дробнымі таварамі.

У канцы 19 — пачатку 20 стагоддзя была пракладзена чыгунка Глыбокае — Свянцяны. У 1907 г. праз тэрыторыю Глыбоччыны прайшла чыгунка, якая злучыла Замошша, Падсвілле, Празарокі.

Напярэдадні і ў час рэвалюцыі 1905—07 гг. на Глыбоччыне ажывіўся рэвалюцыйны і грамадскі рух. У 1897 г. тут была створана арганізацыя Бунда, якая прадстаўляла інтарэсы дробнай буржуазіі, яўрэйскіх гандляроў, рамеснікаў, майстравых. У 1904 г. Віленская група РСДРП распаўсюдзіла ў Глыбокім лістоўкі Паўночна-Заходняга камітэта РСДРП, у якіх вялася агітацыя супраць царызму і руска-японскай вайны. З нагоды Першамая ў 1903 і 1905 гг. праводзіліся маёўкі ў Лаўрынаўскім лесе за 2 км ад мястэчка. У пачатку лістапада 1905 г. адбылася дэманстрацыя жыхароў Глыбокага, у якой прыняло ўдзел некалькі соцень чалавек. Дэманстранты сабраліся на рыначнай плошчы, узнялі над калонай чырвоны сцяг і з лозунгамі «Далоў царскае самадзяржаўе!», «Няхай жыве рэвалюцыя!», са спяваннем рэвалюцыйных песень рушылі па Замкавай вуліцы праз мост да царкоўнага саду, дзе адбыўся мітынг.

У лістападзе 1905 г. забаставалі паштовыя служачыя Глыбокага. Забастоўка працягвалася тры тыдні, у выніку большасць служачых была звольнена.

У 1905 г. зноў ажывіўся сялянскі рух. Праявілася гэта ў парубках памешчыцкага лесу, патравах лугоў і пасеваў. 31 снежня 1905 г. прыстаў 1-га стана Дзісенскага павета сумесна з 3 паліцэйскімі ўраднікамі, 4 коннымі і 8 пешымі стражнікамі прыбылі ў в. Хоцькі, каб арыштаваць у маёнтку Канстанцінава памешчыка Акушкі галоўных зачыншчыкаў самавольнай парубкі лесу Баляслава Мархеля, Уладзіслава Крэміса і Францa Мацвяёнка. Калі першы з іх быў

арыштаваны, то натоўп сялян, узброеных каламі, акружыў паліцыю, патрабуючы вызвалення Мархеля, прытым з натоўпу раздаліся стрэлы, адным з якіх быў паранены паліцэйскі ўраднік Лабаты.

Убачыўшы небяспеку, прыстаў даў папераджальны залп у паветра, а калі і гэта натоўп не спыніла, то стрэламі па бунтаўшчыках былі забіты Бярнард Крэміс і Іван Мацвяёнак, а Аляксандр Філіповіч паранены. Пасля гэтых падзей спробы вызваліць арыштаваных не прадпрымаліся. Калі Мархеля даставілі ў станавую кватэру, яго абаранялі два дзесяткі салдат. 1-га студзеня адзін з іх, Адам Панцялееў, выпусціў арыштаванага і ўцёк разам з ім.

Царская ўлада ў той час у Глыбокім была прадстаўлена звычайнай адміністрацыяй і паліцыяй: станавым прыставам, паліцэйскімураднікам, двума жандарамі, судзебным следчым, земскім начальнікам і іншымі чыноўнікамі, а таксама 2 святарамі і ксяндзом.

Націск народных мас прымусіў царызм утварыць агульнадзяржаўную прадстаўнічую ўстанову — Дзяржаўную думу, маніфест пра зацвярджэнне якой быў надрукаваны 6 жніўня 1905 г. У Расійскі «парламент» дапускаліся і прадстаўнікі працоўных. Але права прымаць удзел у выбарах былі пазбаўлены рабочыя. Магутны пад'ём руху выліўся ў кастрычніку 1905 г. ў агульнарасійскую палітычную стачку. Яна ахапіла ўсю краіну, і ў снежні 1905 г. перарасла ва ўзброенае паўстанне.

Урад перайшоў у адкрытае наступленне на рэвалюцыю. Указам цара ад 8 ліпеня 1906 г. Дзяржаўная дума была разагнана. На дапамогу мясцовай паліцыі ўсё часцей выклікаліся войскі; былі зацверджаны ваенна-палявыя суды. Увесь ход падзей 1905 г. паказаў, што галоўным пытаннем грамадска-палітычнага жыцця Расіі было аграрнае. Імкнучыся аслабіць яго вастрыню, урад выдаў указ пра землеўпарадкавальныя камісіі. Яны былі заклікаты садзейнічаць Сялянскаму банку ў набыцці зямлі сялянамі шляхам продажу ім часткі казённых і ўдзельных зямель. Але гэтыя паўмеры не задавальнялі сялян, і яны вялі барацьбу за поўную ліквідацыю памешчыцкага землеўладання.

У пачатку 1907 г. адбыліся выбары ў 2-ю Дзяржаўную думу. Палітычны настрой сялян знайшоў сваё адлюстраванне ў наказах у 2-ю Думу. Сяляне патрабавалі роўнасці ўсіх перад законам, свабоды сходаў, саюзаў, скарачэння рабочага дня, павышэння заработнай платы.

У рабочым руху Беларусі ў пачатку 1907 г. працягваўся спад. Аднак у красавіку пракацілася хваля першамайскіх забастовак. Агульная забастоўка рабочых і рамеснікаў адбылася 18 красавіка і ў Глыбокім.

Да восені размах рабочага і сялянскага руху скарачаецца, а з кастрычніка — уступае ў паласу глыбокага крызісу.

Выкарыстаўшы спад рэвалюцыйнага руху ў краіне, царызм устанавіў жорсткі паліцэйскі рэжым. 9 чэрвеня 1907 г. ўрад надрукаваў Маніфест аб роспуску 2-й Думы і змяненні Палажэння аб выбарах. Землеўладальніцкая курыя атрымлівала паводле закону 3 чэрвеня 51% агульнага складу выбаршчыкаў Еўрапейскай Расіі. Памешчыцкая курыя Віленскай губерні выбірала на губернскія сходы 43%. Заніжаны працэнт выбаршчыкаў ад памешчыкаў у Віленскай губерні быў звязаны з імкненнем урада абмежаваць прадстаўніцтва ў Доме польскага памеснага дваранства.

Чарнасоценныя партыі і групоўкі з натхненнем сустрэлі разгон 2-й Думы і новы выбарчы закон. 17—19 ліпеня 1907 г. адбыўся Усерасійскі з'езд прадстаўнікоў губернскіх і павятовых аддзелаў «Саюза рускага народа» («СРН») і іншых манархічных груповак, на якім было вырашана разаслаць усім аддзелам на месцах выпрацаваныя і ўхваленыя з'ездам перадвыбарны наказ і перадвыбарную платформу. Галоўным іх патрабаваннем было захаванне «праваслаўя, рускага неабмежаванага самадзержца і народнасці». У перадвыбарнай платформе падкрэслівалася, што Дума павінна быць органам, непрыхільным да ўсякіх абмежаванняў царскай улады і абавязкова «нацыянальна-рускай». У праекце выбарчай платформы для манархічных арганізацый 5 заходніх губерняў вялікадзяржаўны шавінізм праяўляўся больш адкрыта ў патрабаванні весці ўзмоцненую барацьбу з палякамі, «пагражаючымі ўзброеным паўстаннем», і яўрэямі, дакладна быў вызначаны саюзнік для мясцовых аддзелаў «СРН» у ходзе выбарчай кампаніі — праваслаўныя брацтвы, якія карысталіся «асаблівай увагай улад».

У трэцячэрвеньскі перыяд значна актывізавалася дзейнасць «Рускага ўскраіннага саюза» («РУС»). Да лета 1907 г. быў створаны яго Віленскі губернскі камітэт з густой сеткай аддзелаў у гарадах, паветах і мястэчках губерні. На чале «РУС» былі лідэр віленскай групоўкі «Селяніна» С.А.Кавалюк, царскі чыноўнік А.С.Уруцэвіч і іншыя. У склад «РУС» уваходзіў «Глыбоцкі аддзел «СРН» (утвораны ў лютым 1907 г., складаўся з 30 чалавек, заснавальнікі Ф.Іваноў і протаіерэй Беразвецкага жаночага кляштара А.С.Вяраксін).

У адпаведнасці з новым выбарчым законам у Віленскай губерні была ўтворана «ру-

ская» курыя, якая праводзіла выбары дэпутатаў у Думу асобна ад «нярускага» насельніцтва. 14 кастрычніка ў Вільні на выбарах ад «рускага» насельніцтва губерні, куды былі далучаны і праваслаўныя беларусы, стараверы, лютэране, 40 выбаршчыкаў абралі А.С.Вяраксіна і Р.Р.Замыслоўскага дэпутатамі 3-й Дзяржаўнай думы. Правыя перамаглі на выбарах у Думу і ў астатніх беларускіх губернях. Ім удалося правесці дэпутатамі 80,5% сваіх прадстаўнікоў. Вялікая заслуга ў гэтым належала праваслаўнаму духавенству. Перамога правых стала магчымай і таму, што за ўрадавымі сіламі пайшлі найбольш заможныя беларускія сяляне, інтарэсы якіх выражала, у прыватнасці, таварыства «Селянін». Яны з натхненнем сустрэлі ўрадавы ўказ ад 9 лістапада 1906 г. «Аб дапаўненні некаторых пастаноў дзеючага заканадаўства, якія датычацца сялянскага землекарыстання і землеўладання». Сутнасць указа П.А.Сталыпін зводзіў да наступнага: «... прызнанне недатыкальнасці асабістай уласнасці і, як следства, стварэнне дробнай асабістай уласнасці, права выхаду з абшчыны і вырашэнне пытанняў палепшанага землекарыстання». Прытым стаўка рабілася «не на ўбогіх і п'яных, а на моцных і дужых». З выхадам у свет указа ад 9 лістапада 1906 г. значна актывізавалася дзейнасць Сялянскага пазямельнага банка з мэтай падтрымкі заможных сялян. Асаблівая ўвага аддавалася банку ў паветах Віленскай губерні, дзе адной з галоўных яго задач было садзейнічаць насаджэнню рускіх памешчыкаў і сялян за кошт скарачэння польскага дваранскага землеўладання. Гэта палітыка знайшла шырокую падтрымку ў заможнага беларускага сялянства, якое імкнулася дабівацца такіх умоў, пры якіх, як паведамляў часопіс «Крестьянин» у № 24 за 1906 г., «... лягчэй было б пашыраць памеры сваёй зямельнай уласнасці, а польскі элемент не меў бы магчымасці ўтрымаць буйную зямельную ўласнасць у сваіх руках». У гэтым жа нумары «Крестьянин» заклікаў землеўладальнікаў ставіцца да ўказа 9 лістапада з поўным даверам, таму што ў Думе ён яшчэ «... будзе дапрацаваны і значна палепшыць становішча сялян». Так, прапаноўвалася ўстанавіць норму на памешчыцкую зямлю да 300—400 дзесяцін, каб астатнюю прадаць сялянам.

Аграрнае пытанне было галоўным і ў дзейнасці 3-й Думы, і ў палітычным жыцці наогул. У снежні 1908 — студзені 1909 г. ў Вільні па ініцыятыве таварыства «Селянін» і «Беларускага таварыства» (вылучылася з «Селяніна» ў 1908 г. на чале з Л.Саланевічам) адбыўся з'езд «прадстаўнікоў вёскі» Паўночна-Заходняга краю. Ідэйнымі натхніцелямі гэтага форуму былі дэпутаты 3-й Думы Р.Р.Замыслоўскі, А.П.Сапуноў і протаіерэй А.С.Вяраксін. Апошні патрабаваў у сваёй прамове ад мясцовых улад больш хуткага правядзення рэформы. Перад закрыццём з'езда была прачытана прывітальная тэлеграма П.А.Сталыпіна да з'езда, а Р.Р.Замыслоўскі ўручыў лідэру віленскай групоўкі «Селяніна» С.А.Кавалюку 1000 руб., асігнаваных на часопіс «Крестьянин».

Трэцячэрвеньскі перыяд быў такім этапам у развіцці царскай манархіі, калі нацыянальнае пытанне было вылучана на адно з першых месцаў у праграмах П.А.Сталыпіна. Урад разлічваў шляхам узмацнення нацыянальных рэпрэсій і распальвання нацыянальнай варожасці сутыкнуць народы паміж сабой, пасеяць недавер і варожасць паміж імі. Канчатковая мэта ўрада і крайне правых зводзілася да таго, каб прывесці да поўнай пакорлівасці ўсе нярускія народы Расіі, паралізаваць іх волю да барацьбы за нацыянальнае раўнапраўе. Каардынатарам



Глыбокае ў пачатку 20 стагоддзя. Вуліца Замкавая.

усяго нацыяналістычнага фронту, акрамя Савета аб'яднанага дваранства, з 1910 г. стала фракцыя рускіх нацыяналістаў. Яна ўзнікла ў ходзе работы 3-й Думы. Асноўныя пункты праграмы партыі прадугледжвалі панаванне праваслаўнай царквы і рускай народнасці, садзейнічанне баявой моцы Расіі, нацыянальную і рэлігійную накіраванасць народнай адукацыі.

На ўзор сталічных патрыётаў у Вільні 27 лютага 1912 г. мясцовыя «сапраўды рускія» стварылі штаб для каардынацыі дзейнняў усіх правых сіл губерні. Асноўныя пункты статута Віленскага аддзялення «Рускага нацыянальнага саюза» зводзіліся да наступнага: «...Аб'яднаць мясцовае рускае насельніцтва ў імкненні захаваць нацыянальны дабытак Расіі ў краі — веру, мову і народнасць, умацаваць духоўную і культурную сувязь з карэннай Расіяй». Старшынёй гэтай арганізацыі 30 сакавіка 1912 г. быў выбраны С.А.Кавалюк. Шавіністычная палітыка царызму і правых партый праявілася і ў 3-й Думе. У кастрычніку 1910 г. дэпутаты разглядалі «Палажэнне аб пачатковых вучылішчах». Высокую актыўнасць пры яго абмеркаванні праявілі епіскап Мітрафан (Магілёўская губерня, у 3-й Думе — фракцыя правых) і протаіерэй А.С.Вяраксін, якія галасавалі за прапановы ўрада, імкнучыся не дапусціць распаўсюджвання ў заходніх губернях польскай, яўрэйскай і беларускай моў.

Адзінства рускай дзяржаўнай мовы, выкладанне ва ўсіх урадавых, грамадскіх і прыватных школах выключна на рускай мове, — такой была платформа Віленскага «Рускага нацыянальнага саюза» па гэтым пытанні.

Падзеі 1905—1907 гг. унеслі істотныя змены ў сістэму народнай адукацыі. Акрамя царкоўна-прыходскіх школ, якія існавалі з сярэдзіны 19 стагоддзя, на Глыбоччыне былі адкрыты народныя вучылішчы ў сёлах Кавалі Глыбоцкай воласці, Празарокі і Псуя Празароцкай воласці, вёсцы Чарневічы Чарневіцкай воласці, сяле Свіла Пліскай воласці, вёсцы Мосар Луцкай воласці, сяле Верхняе Верхнянскай воласці, сяле Залессе Залескай воласці.

Працэнт дзяцей школьнага ўзросту (8—13 гадоў), якія наведвалі школы, складаў сярод хлопчыкаў прыкладна 20%, сярод дзяўчынак — 7—8%.

Медыцынскае абслугоўванне краю развівалася з пачатку 70-х гг. 19 стагоддзя. Паводле ўказа ад 24 снежня 1868 г. на кожны павет прызначаўся адзін урач, 7—8 фельчараў і 3 павітухі. Такое становішча было ва ўсіх губернях, дзе не былі ўведзены земствы, у тым ліку і ў Віленскай.

Першы ўрачэбны ўчастак з невялікай лячэбніцай пры ім на Дзісеншчыне быў адкрыты ў м. Лужкі. Ён абслугоўваў 12 валасцей, у тым ліку і Глыбоцкую. Такое становішча захавалася да пачатку 20 стагоддзя. Вядома, што ў 1895 г. ў Глыбокім быў прыёмны пакой, у якім працаваў фельчар Восін Каншыцкі і павітуха Алена Харак. У той час у Глыбокім знаходзіліся вольнапрактыкуючыя ўрачы Ісідор Карлавіч Махтус і Мікалай Станіслававіч Пулікоўскі. Нават у пачатку 20 стагоддзя лячэбніца знаходзілася ў Лужках, а ў Глыбокім заставаўся той жа прыёмны пакой, дзе фельчарам быў Анісім Артаеў, а павітухай Марыя Барушка. Былі тут вольнапрактыкуючы ўрач той жа М.С.Пулікоўскі, прыватная аптэка ўдавы Фелтэртол. Гандляры-яўрэі трымалі 3 аптэкарскія крамы, працавалі магазіны Мордуха Шульгейфера, Моўшы Астроўскага і Моўшы Фейгельсона. Фельчарскі пункт быў у вёсцы Мазурава Чарневіцкай воласці.

Духоўнае жыццё насельніцтва неразрыўна было звязана з рэлігіяй. Праваслаўныя цэрквы былі ў сёлах Псуя Празароцкай воласці, Слабада Докшыцкай воласці, Залессе Залескай воласці, Верхняе Верхнянскай воласці, Свіла і мястэчку Галубічы Пліскай воласці, сяле Быкаўшчына Празароцкай воласці, вёсках Кавалі, Тумашы, Забор'е, Мамаі Глыбоцкай воласці, Чарневічы Чарневіцкай воласці.

Рымска-каталіцкія касцёлы дзейнічалі ў в. Прошкава, сёлах Празарокі Празароцкай воласці, Дзеркаўшчына Норыцкай воласці, вёсцы Мосар Луцкай воласці і сяле Удзела Верхнянскай воласці.

Малітоўны дом старавераў быў у в. Ластавічы Глыбоцкай воласці.

У 1-й чвэрці 20 стагоддзя на Беларусі актывізуецца працэс абуджэння нацыянальнай свядомасці, цягі народа да культуры. Адной з праяў гэтага працэсу сталі так званыя беларускія вечарынкі — вечары беларускай нацыянальнай культуры, якія ладзіліся на Беларусі і за яе межамі творчай інтэлігенцыяй, студэнтамі, рамеснікамі, сялянамі. Актыўны ўдзел у такіх вечарынках бралі вядомыя дзеячы беларускага адраджэння, такія, як І.Буйніцкі са сваім калектывам (глядзі ў артыкуле «Бацька беларускага тэатра»), Паўліна Мядзёлка, чыё юнацтва і першае далучэнне да беларускай культуры прайшлі ў Глыбокім. Найбольшае пашырэнне беларускія вячоркі мелі ў 1910—14 гг. Яны адбываліся ў Празароках, Глыбокім і іншых населеных пунктах Глыбоччыны.

У пачатку 20 стагоддзя беларускі народ чакала цяжкае выпрабаванне. 19 ліпеня (1 жніўня) 1914 г. пачалася 1-я сусветная вайна. З лета 1915 г. значная частка тэрыторыі

Беларусі стала арэнай ваенных дзеянняў. Да восені фронт дакаціўся да Пастаў і нямецкі раз'езд з'явіўся ў Глыбокім, якое апынулася ў прыфрантавой паласе і знаходзілася ў тыле 3-й рускай арміі, што ўтрымлівала ўчастак Заходняга фронту ад возера Дрысвяты да мястэчка Смаргонь. У 1915 г. была пракладзена чыгунка Глыбокае—Паставы. Лінія фронту ў той час праходзіла каля Пастаў, а Глыбокае было прыфрантавой базай забеспячэння арміі. У Глыбокім было пабудавана некалькі станцыйных пуцей, дзе фарміраваліся воінскія саставы для адпраўкі на фронт. Цяжкае становішча на фронце, адступленне рускай арміі выклікалі ў большай часткі салдат паражэнчыя настроі, глыбокую незадаволенасць. З кожным днём нарастаў пратэст супраць вайны і царызму. Усё настойлівей сяляне выступалі за дэмакратычнае рашэнне аграрнага пытання. Мясцовыя ўлады адзначалі, што «...галоўным і самым небяспечным фактарам росту незадаволенасці сярод сялян з'яўляюцца салдаты, што прыбываюць з тылавых часцей і на пабыўку... яны распаўсюджваюць чуткі аб тым, што пасля заканчэння вайны са зброяй у руках пачнуць падзел зямлі». Яны адзначалі «...поўную адсутнасць клопату ўрада да сем'яў салдат, якія былі асуджаны на голад, і на ўхіленне генералаў і афіцэраў ад удзелу ў небяспечных месцах баёў».

Пра падзеі сусветнай вайны на Глыбоччыне і трагічны лёс бежанцаў расказала ў сваіх «Успамінах» Е.А.Сурына-Масальская (гл. адпаведны артыкул).

Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. не прынесла вялікіх змен для насельніцтва Глыбоцкага краю. У Глыбокім захаваліся мяшчанская ўправа і валаснoе праўленне, якія ў красавіку 1917 г. былі заменены часовымі камітэтамі з тымі ж функцыямі.

Рэвалюцыйныя пераўтварэнні далі надзею на лепшую долю беларускага народа. Актыўна пачалі ўзнікаць беларускія арганізацыі, газеты, часопісы. 24 і 25 мая 1917 г. ў Мінску адбыўся з'езд беларускага каталіцкага духавенства. З'езд меў вялікае значэнне, ён абудзіў да працы і тых ксяндзоў, якія даўно забыліся пра сваю беларускасць. Пасля з'езда ў многіх месцах ксяндзы пачалі весці набажэнствы на беларускай мове. Адзін з актыўных праваднікоў беларускай ідэі ксёндз А.Станкевіч у сваёй кнізе «Родная мова ў святынях» (Вільня, 1929) згадвае, што беларускія набажэнствы вяліся на Дзісеншчыне, у тым ліку і на Глыбоччыне. Так, ксёндз М.Шалкевіч вёў службу па-беларуску ў в. Мосар, пасля чаго прыхаджане прасілі біскупа, каб у іх парафіі пакінулі менавіта ксяндза М.Шалкевіча. Час ад часу беларускія набажэнствы вяліся ў в. Удзела.

2 ліпеня 1917 г. галоўнакамандуючы Заходнім фронтам генерал-лейтэнант Дзянікін выдаў загад, паводле якога ўвесь Дзісенскі павет быў аднесены ў раён Заходняга фронту і ўсё жыццё ў павеце павінна было быць падпарадкавана законам ваеннага становішча. Былі забаронены мітынгі, дэманстрацыі, выступленні супраць улад і памешчыкаў. Тым не менш 10 ліпеня сяляне вёскі Пятроўскія маёнтка Кацярынава, які быў размешчаны за 7 вёрст на поўнач ад Глыбокага, захапілі скошаную канюшыну, прагналі касцоў памешчыка Жадвойна і аб'явілі ўсе сенажаці сваёй уласнасцю. Сялянскія хваляванні ў розных месцах Глыбоччыны працягваліся амаль да Кастрычніцкага перавароту.

*М.М.Забаўскі.*

## Паўстанне 1863—64 гг. на Глыбоччыне

Паўстанне 1863—64 гг., мэтай якога было сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне ад царскай Расіі беларускага, польскага і літоўскага народаў, — адна з найбольш значных падзей 19 стагоддзя.

Але ацэнкі яго вельмі супярэчлівыя. Пра гэта сведчаць шматлікія гістарычныя даследаванні і архіўныя дакументы, у якіх зафіксавана, што актыўны ўдзел у гэтым паўстанні прынялі сяляне і шляхта, рамеснікі з мястэчак, студэнты і духавенства Глыбоччыны.

У сваім данясенні ад 23 мая 1861 г. падпалкоўнік С.Адамовіч паведамляў у Вільню В.А.Далгарукаву, што войскам Мурамскага пяхотнага палка падаўлена выступленне сялян у маёнтках Дзісенскага павета, сярод якіх пералічаны і падзеі на Глыбоччыне. Так, паведамлялася, што хваляванні былі ў маёнтку Мосар, які належаў Абдону Бжастоўскаму, у Міхальцах, што належалі Юстыну Грабніцкаму, Канстанцінаве, якім валодаў Казімір Акушка. Прычынай выступленняў была агітацыя адстаўнога падпалкоўніка Антаноўскага з Глыбокага, які ўжо знаходзіўся пад арыштам да вырашэння пытання вышэйшым начальствам. У час хваляванняў было захоплена «более